СУВЯЗІ З ЗАМЕЖЖАМ




Голуб – сімвал правоў чалавека, міру і сяброўства – яшчэ больш аб'яднаў дзяцей з Германіі і Беларусі.

# Голуб з Германіі прызямліўся ў СШ №5

**Сумесныя праекты СШ №5 і Хайнбергскай гімназіі германскага горада Гётынгена атрымліваюць высокую ацэнку грамадскасці і служаць умацаванню сяброўства і ўзаемаразумення.**

— Гэтага бронзавага голуба стварыў нямецкі скульптар Рыхард Халінгер. Ён сімвалізуе правы чалавека і знаходзіцца ў нашай гімназіі ўжо тры гады, — расказвае Моэкэн Элькэ, кіраўнік нямецкай дэлегацыі, якая ў чарговы раз наведала СШ №5 з сяброўскім візітам.

Цікава было даведацца, што за тры гады гэты голуб разам з гімназістамі і іх педагогамі «абляцеў» нямала краін – Кітай, Злучаныя Штаты Амерыкі, Францыю, Танзанію, Польшчу і ўпершыню «прызямліўся» ў Беларусі. І прынёс на сваіх крылах надзвычай прыемную вестку. Як паведаміла спадарыня Моэкэн Элькэ, сумеснае шматгадовае супрацоўніцтва СШ №5 і Хайнбергскай гімназіі было высока ацэнена на канферэнцыі міністраў культуры зямель ФРГ, названа лепшым праектам кастрычніка 2011 года і адзначана дыпломам і грантам у суме 450 еўра. Урачыстая цырымонія перадачы дыплома прайшла ў час сустрэчы ў Палацы культуры г. Маладзечна. На ёй акрамя нямецкіх гасцей, адміністрацыі, выкладчыкаў і вучняў СШ №5 прысутнічалі загадчык сектара выхаваўчай і ідэалагічнай работы аддзела адукацыі райвыканкама Анатолій Васільевіч Кацельнікаў і загадчыца метадычнага кабінета Аксана Валянцінаўна Семеж, якія пазнаёмілі замежных сяброў з сістэмай адукацыі нашага раёна. У якасці перакладчыка была выкладчыца нямецкай мовы СШ №5 Зоя Міхайлаўна Дылеўская.

Мы неаднойчы на старонках газеты расказвалі пра адзін з сумесных праектаў, у рамках якога вучні і выкладчыкі Хайнбергскай гімназіі збіраюць сродкі, каб дапамагчы юным маладзечанцам, хворым на цукровы дыябет, набыць апараты для вымярэння ўзроўню глюкозы ў крыві і тэст-палоскі да іх. Вось і нядаўна ў дзіцячай паліклініцы адбылася перадача чарговай партыі тэст-палосак сем'ям, дзе выхоўваюцца хворыя дзеці. Для іх гэта вялікая дапамога: адна палоска каштуе прыблізна 50 цэнтаў, а на дзень іх патрэбна каля пяці...

— Цяпер мы пачынаем новы праект «Экасістэма лясоў Беларусі і Германіі», — сказаў падчас сустрэчы дырэктар СШ №5 Яўгеній Васільевіч Макарэвіч. – Нашы нямецкія сябры разам са сваімі беларускімі равеснікамі, у сем'ях якіх яны жылі, пабывалі ў маляўнічых мясцінах у раёне Верадова, наведалі Мінскі батанічны сад, Залессе, пасадзілі алею Дружбы непадалёк ад вёскі Крыніца.

Як заўсёды, праграма візіту была вельмі насычанай, і ў нямецкіх школьнікаў засталося шмат уражанняў ад знаходжання ў Маладзечне.

— У вас вельмі маляўнічая прырода, прыгожы горад, добразычлівыя людзі! А сем'і, у якіх мы жывём, надзвычай гасцінныя. Нас вельмі смачна кормяць. Спадзяёмся, што мы наведаемся ў Маладзечна яшчэ раз, — наперабой гаварылі ў час сустрэчы юныя немцы, якія прыехалі ў суправаджэнні выкладчыкаў Моэкэн Элькэ і Грот Рут.

За 15 гадоў цеснага супрацоўніцтва склалася нямала традыцый. Адна з іх – магчымасць для лепшага вучня СШ №5 цэлы год вучыцца ў Хайнбергскай гімназіі. Вось і сёлета разам з нямецкай дэлегацыяй у Германію паедзе чарговая стыпендыятка — адзінаццацікласніца Аня Лук'янчык. У мінулым годзе разам з дэлегацыяй сваёй школы яна пабывала ў Гётынгене. Больш таго, пасябравала з нямецкай дзяўчынкай Ханнай, у сям'і якой і будзе жыць на працягу года. Ханна прыехала ў Маладзечна ў складзе дэлегацыі, і яе прымала сям'я Ані. Вось так плённае супрацоўніцтва паміж навучальнымі ўстановамі пераходзіць у сапраўднае сяброўства паміж вучнямі і іх сем'ямі...

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Тэл. 77-19-61.**
**Фота Аляксея ПЛАТКО.**